Таким образом, диагностика ПН как показателя готовности к выбору профессии – сложный и многоэтапный процесс. Для полной диагностики уровня профессиональной направленности необходимо применять несколько методик к одним и тем же респондентам.

**ЛИТЕРАТУРА**

1. Дубровицкая, Т. Д. Диагностика уровня профессиональной направленности студентов / Т. Д. Дубровицкая // Психологическая наука и образование. 2004. – №2. – С. 82-86.
2. Климов, Е. А. Образ мира в разнотипных профессиях / Е. А. Климов. – М.,1995 – 85 с.
Никиреев, Е. М. Направленность личности и методы ее исследования / Е. М. Никиреев. – М. – Воронеж, 2004. -54 с.

УДК 37.014.543: 63 (476.6)

# ВУЧЭЛЬНЯ, ЯКАЯ НЕ АПРАЎДАЛА ЧАКАННІ: АЗЯРНІЦКАЯ ПАЧАТКОВАЯ СЕЛЬСКАГАСПАДАРЧАЯ ШКОЛА Ў 1913-1915 ГГ.

**Галубовіч В. У., Радзюк А. Р.**

УА «Гродзенскі дзяржаўны аграрны ўніверсітэт»
г. Гродна, Рэспубліка Беларусь

Асобнай старонкай у гісторыі сельскагаспадарчай адукацыі ў Гарадзенскай губерні з'яўляецца непрацяглы перыяд дзейнасці Азярніцкай пачатковай сельскагаспадарчай школы, якая размяшчалася ў Чэмерскай воласці Слонімскага павета. Установа гэта была заснавана Гарадзенскім губернскім распарадчым камітэтам у 1912 г. Яна пачала сваю працу ў 1913 г. Згодна з "правіламі", на падставе якіх функцыянавала школа, яе галоўнай мэтай было пашырэнне ведаў у галіне сельскай гаспадаркі сярод сялян. Школа павінна была існаваць за кошт трох крыніц: сродкаў Галоўнай управы землеўладкавання і земляробства (3050 руб.), Губернскага распарадчага камітэта (1000 руб.) і аказіянальных ахвяраванняў [2, арк. 10].

Навучанне ў школе было бясплатным, разлічаным на два гады. Агульнай сумы сродкаў павінна было хапаць на ўтрыманне 20 вучняў ва ўзросце ад 15 да 18 гадоў, якія скончылі аднакласныя сельскія вучэльні [2, арк. 10]. Навучальная праграма ўключала тэарэтычную і практычную падрыхтоўку. Абавязковымі былі і агульнаадукацыйныя прадметы як па гуманітарнаму, так і прыродазнаўчаму цыклу. Адметнасцю навучальнага працэса ў школе была арганізацыя практычнай часткі, якая павінна была праходзіць як на базе школы, так і ў гаспадарках бацькоў вучняў пад кіраўніцтвам настаўнікаў [2, арк. 10 адв.].



РЕПОЗИТОРИЙ ГГАУ

Гаспадарчая частка школы была арганізавана на “*сялянскі ўзор*”. Пры ўстанове было практычнае поле, скотны двор, сад, агарод і пасека [2, арк. 10 адв.– 11].

Паводле зацверджаных “правілаў”, сама школа непасрэдна падлягала дагляду з боку Гарадзенскай управы земляробства і дзяржмаёмасці, а Гарадзенскі распарадчы камітэт абіраў на тры гады апекуна, які мусіў займацца ўсімі справамі школы. Непасрэднае кіраванне школы ўскладалася на загадчыка і так званую Педагагічную раду, якая складалася з самога загадчыка, настаўніка і законанастаўніка [2, арк. 11].

Самая актыўная роля ў арганізацыі і забеспячэнні школы, што, дарэчы, не было абгаворана “правіламі”, была ў рэальнасці адведзена галоўнаму спецыялісту па сельскай гаспадарцы ў рэгіёне – урадаваму аграному. Ён павінен быў адказваць за ўвесь спектр праблем, звязаных з матэрыяльным забеспячэннем школы, падборам супрацоўнікаў. Так, уласна выконваючаму абавязкі ўрадавага агранома Гарадзенскай губерні Пятру Лешчанку ў 1912-1913 гг. прыйшлося займацца забеспячэннем навучальнай установы ўсім неабходным (пачынаючы з цвікоў, школьнага званка, чарнільніц, пячаткі, канцылярскіх тавараў, мэблі, матрацаў, ікон і скончваючы сельскагаспадарчым абсталяваннем) [2, арк. 17-18 адв.]. Да пачатку вайны фінансаванне школы, відаць, было дастатковым. У сваёй справаздачы ў Гарадзенскі губернскі распарадчы камітэт ад 28 студзеня 1914 г. загадчык школы паведамляў, што на выдадзеную суму ў памеры 850 рублёў былі набыты “***усе дапаможнікі, пералічаныя ў пастановах Камітэта па ўладкаванні школы****, акрамя жывога інвентару (пара коней). Коней не набывалі па той прычыне, што на маё меркаванне, набываць іх на зіму не было патрэбы, паколькі пракорм іх у зімовы час каштаваў бы вельмі дорага*” [2, арк. 33-33 адв.].

Але літаральна некалькі месяцаў працы школы выявілі ў яе арганізацыі значныя недахопы, што вымусілі Педагагічную раду звяртацца ў Камітэт, які займаўся ўладкаваннем школы. Так, 20 снежня 1913 г. Педагагічная рада пастанавіла ператварыць школу з пачатковай у народную. Пастанова была падтрымана ўрадавым аграномам А.С. Еленеўскім, які звярнуўся ў Камітэт з просьбай аб хадайніцтве перад Дэпартаментам земляробства аб адпаведных зменах [2, арк. 8]. Усё гэта сведчыла пра тое, што дзяржаўныя чыноўнікі дзейнічалі ў вялікай ступені па шаблоне і не пралічвалі наступствы сваіх крокаў.

Пэўная хаатычнасць у працы структур, падпарадкаваных Галоўнай управе землеўладкавання і земляробства ў Гарадзенскай губерні, несумненна, была вынікам цякучкі кадраў, якая з пачатку



РЕПОЗИТОРИЙ ГрГУ

Першай сусветнай вайны яшчэ больш павялічылася. Бясконцыя змены кіраўніцтва мала спрыялі наладжванню працы і Азярніцкай школы. За два гады яе існавання – з 1913 па 1915 гг. – школай паспелі пакіраваць тры асобы. Спачатку часова выконваў абавязкі загадчыка спецыяліст па малочнай гаспадарцы Міхаіл Іванавіч Цуркан, але ўжо з кастрычніка 1913 г. на чале школы быў Яўген Іванавіч Атаназевіч, гадаванец Мошнагарадзішчанскай ніжэйшай сельскагаспадарчай школы [2, арк. 9, 33; 3, арк. 47]. Я. І. Атаназевіч меў званне ветэрынарнага фельчара, якое было выдадзена яму "*экзаменацыйнай камісіяй Лейб-Гвардыі Гарадзенскага палка ад 3 лютага 1910 г.*" [2, арк. 5]. Але напоўніцу рэалізавацца на пасадзе Я. Атаназевічу не дазволіла вайна: ужо з 24 ліпеня 1914 г. загадчыкам школы стаў малодшы інструктар па паляводстве Мікалай Пятровіч Уласаў замест прызванага ў войска Атаназевіча [2, арк. 105]. Ад'езд Я. Атаназевіча ў дзейсную армію адбыўся даволі хутка, так што загадчык не паспеў, альбо і не спяшаўся, належным чынам афарміць перадачу спраў. Толькі праз год пасля мабілізацыі, а дакладней, у другой палове жніўня 1915 г., знаходзячыся ў войску, Я. Атаназевіч даслаў урадаваму аграному вопіс маёмасці (копія была перададзена выконваючаму абавязкі загадчыка), якую ён пакінуў у Азярніцкай школе [1, арк. 30]. Цікава, што справы Я. Атаназевіч, згодна з яго асабістым рапартам ад 3 жніўня 1914 г., здаў настаўніку слова Божага святару Кальвіну [2, арк. 89], але яшчэ 7 жніўня ўрадавы аграном пісаў да Атаназевіча як да "загадчыка" [2, арк. 90].

Новы кіраўнік школы апынуўся ў досыць няпэўным становішчы, паколькі яго маглі ў любую хвіліну прызваць у армію. Літаральна 1 жніўня 1914 г. на імя ўрадавага агранома А. С. Еленеўскага прыйшло паведамленне ад супрацоўніка Дэпартамента земляробства Паўла Катовіча, які дакладаў, што "*аказваецца, і М.П. Уласаву належыць адправіцца ў войска ... адпаведна, неабходна ізноў сур'ёзна паклапаціцца аб Азярніцкай сельскагаспадарчай школе*" [2, арк. 86]. П. Катовіч прапаноўваў некалькі кандыдатур на загадчыка школы. У першую чаргу, ён звярнуў увагу на загадчыка вучэбнай гаспадаркай зачыненай Краснастоцкай сельскагаспадарчай вучэльні Міхно. Катовіч быў упэўнены ў тым, што "*у Азярніцкай сельскагаспадарчай школе заняткі маглі б ісці ў нармальным парадку: зараз усе шэсць вучняў на месцы, працуюць, але няма выкладчыкаў і кіраўнікоў*" [2, арк. 86 адвю-87]. Але, не гледзячы на досыць песімістычныя прагнозы свайго калегі, М. П. Уласаў не толькі адпрацаваў жнівень 1914 г., але кіраваў школай і ў наступным годзе. Больш таго, прызыў яго не кранууў, і ў восені



РЕПОЗИТОРИЙ ГГТАУ

1915 г. ён быў эвакуіраваны ў Калугу разам з іншымі супрацоўнікамі Дэпартамента земляробства Гарадзенскай губерні [4, с. 234].

М. П. Уласаў даволі хутка зарыентаваўся ў тым, што ў працы школы не было парадку. Ён сутыкнуўся з вельмі дзіўнай сітуацыяй, пра якую ўжо 12 жніўня 1914 г. інфармаваў урадавага агранома: "*Па паведамленні законанастаўніка Азярніцкай сельскагаспадарчай школы, пры ёй няма ні статута, ні праграмы, якой я мог бы карыстацца. Аб'ём прадметаў, якія выкладаліся, вызначаўся асабістым поглядам выкладчыкаў. Знаходзячы асабістае меркаванне ў дадзеным выпадку немэтазгодным, звяртаюся да Вас з пакорнай просьбай звярнуцца ў Дэпартамент земляробства адносна высылкі зацверджанага статута і праграмы Азярніцкай пачатковай сельскагаспадарчай школы*" [2, арк. 92]. Пад кіраўніцтвам М. П. Уласава праца пайшла больш руплівa. Педагагічная рада школы вызначыла тэрміны прыёмных іспытаў у школу, якія былі прызначаныя на 15 верасня, а пераводны іспыт з першага класа ў другі быў прызначаны на 12 верасня 1914 г. [2, арк. 93]. Асабісты клопат відаць і ў тым, што 30 жніўня Уласаў звяртаўся да ўрадавага агранома з просьбай паведаміць, хто будзе выкладаць агульнаадукацыйныя прадметы ў навучальнай установе [2, арк. 96].

Зыходзячы з няпэўнага становішча М.П. Уласава, 18 жніўня 1914 г. урадавы аграном звярнуўся ў Дэпартамент земляробства з просьбай аб прызначэнні новага загадчыка школы і ў верасні атрымаў адказ, дзе паведамлялася, што выконваючым абавязкі прызначаўся "*стыпендыят Дэпартамента, які скончыў у бягучым годзе Пскоўскую сельскагаспадарчую вучэльню, Зміцер Варанкоў, з выдачай яму ўзнагароджання з аклада 750 рублёў у год"* [2, арк. 98].

Але абяцаны загадчык не спяшаўся на сваё месца, таму 17 лістапада 1914 г. Еленеўскі звярнуўся ў Дэпартамент з просьбай прызначыць новага часовага загадчыка Азярніцкай школы, паколькі Зміцер Варанкоў так і не з'явіўся для выканання сваіх абавязкаў у Азярніцу, а інструктар Уласаў быў "*неабходны ў тым раёне губерні, які ім абслугоўваўся для выканання сваіх прамых абавязкаў*". Просьба была паўторана 24 лістапада [2, арк. 103-103 адв, 104-104 адв.]. Па ўсім відаць, што альтэрнатывы М.П. Уласаву не было, і ён затрымаецца ў школе надоўга і ўсур'ёз. 25 лістапада 1914 г. Еленеўскі даслаў яму "*копію з копіі правіл Азярніцкай пачатковай сельскагаспадарчай школы*" [2, арк. 1]. Таму выкладанне ў школе да зімы, відаць, ішло па-старому, "*на погляд выкладчыка*". Сітуацыя не змянілася і пазней: 17 снежня Еленеўскі дасылаў Уласаву як загадчыку нейкія адносіны з Дэпартамента [2, арк. 110].



РЕПОЗИТОРИЙ ГГАУ

“Часовы” кіраўнік Азярніцкай школы быў вымушаны развіваць ранейшыя ініцыятывы “педагагічнага калектыва” школы пра змены яе статуса. Праўда на гэты раз гаворка ішла пра пераўтварэнне яе ў “*практычную школу садаводства, агародніцтва і пчалярства*”. Пра тое, што ў працы ўстановы назіраліся неадпаведнасці, сведчыць пратакол пасяджэння Педагагічнай рады школы ад 6 красавіка 1915 г., дзе ў першым жа абзацы было адзначана: *“умовы, у якіх знаходзіцца школа, ... з’яўляюцца вельмі неспрыяльнымі для ажыццяўлення задач школы*”. Сход канстатаваў наяўнасць шэрагу парушэнняў “правілаў”, на падставе якіх дзейнічала школа. Так, насуперак трэцяму параграфу “правілаў”, згодна з якім навучэнцаў належала набіраць з розных паветаў Гарадзенскай губерні, дэ факта большасць вучняў паходзіла з вёсак, якія размяшчаліся на адлегласці да 35 вёрст ад Азярніцы. Невыканальнай Педагагічная рада палічыла і пункт пяты “правілаў”, які патрабаваў, каб вучні на працягу навучальнага перыяду працавалі ў сваіх асабістых гаспадарках пад кіраўніцтвам настаўнікаў [1, арк. 9].

Фармальным быў таксама названы пункт чацверты “правілаў”, бо патрабаваў, каб вучні былі “прыходзячымі”, але на практыцы яны былі вымушаны здымаць кватэры і выдаткоўваць значныя грошы, што “*надзвычай абцяжарвае бюджэт іх бацькоў і пазбаўляе магчымасці жадаючых вучыцца ў школе*” [1, арк. 9].

Вельмі цікавымі з’яўляюцца і вынікі апытання саміх вучняў, агучаныя на нарадзе. Было высветлена, што літаральна “*кожны з іх*” імкнуўся не вяртацца па сканчэнні школы да бацькоўскай гаспадаркі, а паступіць на якую-небудзь службу. Паколькі ў сялянскіх гаспадарках не існавала дэфіцыту працоўных рук, то многія з’язджалі на працу ў Маскву, Пецярбург і “*нават у Амерыку*”. Увогуле, школьная рада прыйшла да маласуцяшальнай высновы, што сяляне, якія аддавалі сваіх дзяцей вучыцца, разглядалі школу як своеасаблівы трамплін для далейшага “сацыяльнага росту” і менш за ўсё разлічвалі на вяртанне сваіх дзяцей дадому. З гэтага Педагагічная рада рабіла выснову, што школа не можа выконваць сваю асноўную задачу, г.зн., даваць належныя веды тым, хто потым будзе займацца сельскай гаспадаркай, што патрабаваў першы параграф “правілаў”. Выкладзеныя аргументы далі падставы Педагагічнай радзе высунуць прапанову аб рэарганізацыі школы. Улічваючы спецыфіку размеркавання ўгоддзяў, якія належалі школе, і кліматычныя асаблівасці губерніі, было прынята рашэнне хадайнічаць аб ператварэнні ўстановы ў практычную школу садаводства, агародніцтва і пчалярства, тым больш, што на Гарадзеншчыне адсутнічалі адпаведныя практычныя школы [1, арк. 9 адв., 14].



РЕПОЗИТОРИЙ ГГАУ

Часовы загадчык школы, інструктар па паляводстве М. П. Уласаў не толькі правёў адпаведнае пасяджэнне Педагагічнай рады, але і прадставіў урадаваму аграному праект статута "Азярніцкай практычнай школы". М. П. Уласаў прасіў падтрымкі ў гэтай справе з боку ўрадавага агранома ў адносінах, датаваных 14 красавіка 1915 г. Адпаведнае хадайніцтва было аддадзена ў Дэпартамент земляробства 18 красавіка [1, арк. 6, 7, 8, 10-13]. 5 траўня 1915 г. у адказ на яго просьбу ўрадавы аграном дазволіў яму звяртацца з такой просьбай у Гарадзенскі распарадчы камітэт [2, арк. 117]. Але ўжо 13 траўня камітэт давёў да А.С. Еленеўскага, што знайшоў такія пераўтварэнні "*несвоечасовымі*" і адклаў іх "*да аднаўлення, пасля сканчэння вайны, нармальнага парадку ў кіраванні школай*" [2, арк. 119].

Сельскагаспадарчая школа ў Азярніцы прапрацавала два гады. За гэты час толькі адна група сялянскіх дзяцей прайшла паўнавартасны курс навучання, але невядома, ці паспелі яны атрымаць належныя пасведчанні. Досвед працы школы паказаў, што для мясцовых сялян сельскагаспадарчая адукацыя была не мэтай, а толькі сродкам гарантаваць жыццёвыя перспектывы для сваіх дзяцей. З гэтага пункту гледжання, задачы (у першую чаргу, пашырэнне сельскагаспадарчых ведаў для іх практычнага выкарыстання сялянамі), якія ставілі перад сабой улады, школа фактычна не выканала.

**КРЫНІЦЫ**

1. НГАБ у Гродне. Ф. 361, воп. 1, спр. 22.
2. НГАБ у Гродне. Ф. 361, воп. 1, спр. 32.
3. НГАБ у Гродне. Ф. 31, воп. 1, спр. 914.
4. Галубовіч, В. У., Радзюк, А.Р. *Эвакуацыя персанала і маёмасці дэпартамента земляробства Гарадзенскай губерні ў 1915 г.* // XVI Международная научно-практическая конференция «Современные технологии сельскохозяйственного производства». Материалы конференции. Гродно, 2013. – С. 233-236.

УДК 476.6:657.474(476.6)

## ДЕЯТЕЛЬНОСТЬ РИМСКО-КАТОЛИЧЕСКОГО БРАТСТВА СВЯТОГО МАРТИНА (XIX В.)

**Ганчар А. И.**
УО «Гродненский государственный аграрный университет»
г. Гродно, Республика Беларусь

По распоряжению Виленского генерал-губернатора А. Л. Потапова, пришедшего на смену Э. Т. Баранову 2 марта 1868 г., к концу 1869 г. в Виленской и Гродненской губерниях были закрыты все рим-



РЕПОЗИТОРИЙ ГГАУ